Ба 15412

Ба 15412 бр.

Инв 1853

Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся

# ІНСТЫТУТ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

# СПРАВАЗДАЧА

## Навуковага Таварыства па вывучэньню Беларусі пры Беларускай Дзяржаўнай Акадэміі Сельскае Гаспадаркі ў Горках Інстытуту Беларускай Культуры (ад 9-га сакавіка 1926 году да 15-га сакавіка 1927 году)

Ба 15412

25. 04. 2009

БССР Дзяржаўная бібліятэка імені Леніна

Ба 15412 бр. Инв. 1953 г.

# СПРАВАЗДАЧА

## Навуковага Таварыства па вывучэньню Беларусі пры Беларускай Дзяржаўнай Акадэміі Сельскае Гаспадаркі у Горках Інстытуту Беларускай Культуры (ад 9-га сакавіка 1926 года да 15-га сакавіка 1927 года).

За другі год існаваньня Навуковага Таварыства па вывучэньню Беларусі праца яго значна пашырылася дзякуючы вялікай дапамозе Т-ву з боку Інстытута Беларускай Культуры, сэкцыяй якога зьяўляецца Т-ва, і тэй энэргіі якую праявілі у гэтай працы згуртаваныя у Т-ва навуковыя сілы. За гэты год значна пашырылася, як навукова-дасьледчая праца, так і тэрміналёгічная, выдавецкая і краязнаўчая. Дапамога Інбелкульта, не толькі матар'яльная але й кіраўнічая, дала магчымасьць Т-ву выйсьці з арганізацыйных пытаньняў і зьвярнуць значную увагу на сваю асноўную мэту—вывучэньне Беларусі, для пабудовы у ёй сацыялістычнай гаспадаркі. У такой малавывучанай краіне, як Беларусь, ахапіць зразу ўсе бакі для плянавага вывучэньня краю не магчыма, таму можна і заўважыць у працы Т-ва некаторыя хібы у гэтым напрамку, але-ж далей праца будзе напраўляцца так, як гэтага патрабуе жыцьцё. Жаданьне працаўнікоў Т-ва працаваць па вывучэньню Беларусі і неадкладная патрэба к таму ствараць шпаркасьць у разьвіцьці працы Т-ва.

У склад Т-ва летась уваходзіла 85 членаў, цяпер лік членаў пашырыўся да 115 ч. У працягу году выключана з членаў Т-ва 8 чалавек, як выехаўшых з Акадэміі, дзякуючы неспрыяючых умоў для іх працы. Гэтыя члены не маюць ніякой сувязі з Н. Т-ам. Частка членаў, выехаўшых па гэтых-жа матывах, трымае сувязь з Таварыствам у сваёй працы і далей лічацца членамі Т-ва. Адзін член Т-ва выключан згодна пастановы прэзыдыуму Інбелкульта ад 23 сьнежня 1926 году.

Членамі Т-ва зьяўляюцца 25 прафэсароў, 17 дацэнтаў, 32 асыстэнты, 18 навуковых супрацоўнікаў, 2—селяніна дасьледчыкі і 21 іншых. З іх ня жывуць у Горках 12 асоб.

Членаў Інбелкульта, якія жывуць і працуюць у Горках—22 чалавекі.

Па сэкцыях члены Т-ва разьмяркоўваюцца так: агранамічная—42, прыродазнаўчая—27, лясная 17, земляўпарадкаваньня і мэліарацыі—15; іншыя 14 членаў Т-ва працуюць у тэрміналёгічнай і інш. камісіях.

Праца Т-ва выконвалася на агульных сходах, у Кіраўніцтве Т-ва, у ўпамянёных сэкцыях і камісіях: тэрміналёгічнай, навукова-дасьледчай і рэдакцыйнай.

Працу Т-ва можна раздзяліць на такія часткі: навукова-дасьледчая, краязнаўчая, тэрміналёгічная, выдавецкая і арганізацыйная.

### I. Навукова-дасьледчая праца.

Навукова-Дасьледчая праца Т-ва вялася у напрамку заслухоўваньня

25. 04. 2009

дакладаў аб раней праведзеных досьледах і ў выкананьні новых досьледаў. Заслухоўваліся даклады, як на агульных сходах, так і на сэкцыях. Распрацоўка новых тэм згодна дасьледчага пляну Т-ва вядзецца членамі яго пасьля разгляду гэтых тэм у сэкцыях, у Навукова-Дасьледчай Камісіі і канчатковага зацьвярджэньня Кіраўніцтвам Навуковага Т-ва і Інбелкультам.

У гэтым годзе, дзякуючы водпуску Інбелкультам сродкаў на навуковую працу Т-ва, распрацоўваюцца наступныя тэмы: 1) К. М. Коратк а ў: „Вывучэньне грунтовых вод Горацкага раёну“, 2) праф. І. Г Васількоў і З. М. Дзянісаў: „Дасьледаваньне луговых згуртаваньняў на р. Случы і Бярозе“, 3) праф. І. Г. Васількоў і З. М. Дзянісаў: „Дасьледваньне засьметчанасьці культур і глеб Аршанскай акругі“, 4) праф. С. В. Скандракоў: „Вывучэньне засьметчанасьці сялянскіх палеткаў“, 5) А. Ц. Савельяў: „Вывучэньне насеньня на Калініншчыне“, 6) праф. К. Г. Рэнард і Г. Р. Рэго: „Вывучэньне экспартнай канюшыны“, 7) праф. К. Г. Рэнард і Г. Р. Рэго „Дробнарасавае вывучэньне аўсоў і ячменяў“, 8) праф. М. І. Бурштэйн: „Дасьледваньне раёну распаўсюджаньня Слуцкае Бэры“, 9) праф. М. І. Бурштэйн і Р. С. Гуржы: „Дасьледваньне садовае гаспадаркі селяніна дасьледчыка Алеся Сіцько на Мазыршчыне“, 10) праф. Н. Н. Пелехаў: „Сялянская каняводзтва БССР з 1888 па 1912 гг.“ 11) С. І. Журык: „Вывучэньне макухі БССР“, 12) Т. Т. Тавілдарова: „Праверка формулы Флейшмана для малака беларускіх кароў“. 13) М. З. Лайкоў: „Вывучэньне ўплыву агрыкультурнай дзейнасьці Горацкага С.-Г. Інстытуту і Беларускай С.-Г. Акадэміі на насельніцтва БССР“, 14) І. М. Серада: „Вывучэньне дыстаматозу на Беларусі“, 15) О. К. Кедраў-Зіхман: „Вывучэньне беларускіх фасфарытаў і торфу, як угнаеньня“. Паднята пытаньне праф. А. В. Ключаровым аб вывучэньні „pH“ у глебах Беларусі. Членамі Т-ва распрацоўваецца шэраг тэм, на якія ня трэба апэрацыйных выдаткаў. Так, напрыклад-Паўлаў Ф. А. распрацоўвае „Роля навучальных с.-г. фэрм Вузаў і Тэхнікумаў“. Р. І. Пратасеня—„Глебы хутара Фатынь Язэпа Мароза“, пад кіраўніцтвам праф. Мельніка С. П. Маладымі навуковымі працаўнікамі вядзецца досьлед: „Вывучэньне дрэвесных расьлін на Беларусі“ і г. д. Члены Т-ва удзельнічаюць у досьледах, арганізаваных Інбелькультам па вывучэньню глебы, геалёгіі Беларусі, тэхнікі сялянскай гаспадаркі, земляўпарадкаваньне на Беларусі і інш.

За мінулы год на агульным сходзе Т-ва заслухан шэраг наступных дакладаў: 1) А. Ц. Савельяў: „Вапна і матылёвые расьліны на глебах Горацкага раёну“, 2) Г. І. Гарэцкі: „Нацыянальны прыбытак Беларусі“, 3) праф. С. П. Мельнік: „Лесаводна-фэналёгічныя назіраньні“, 4) Ю. Грашавы: „Унівэрсальны тэрма-гідрастат для вэгэтацыйных досьледаў з жывымі аб‘ектамі“, 5) праф. Я. М. Афанасьеў: „Першая глебаведная карта Беларусі“, 6) праф. П. Ф. Салаўёў і А. В. Іваноў: „З Горак Беларускіх да Вялікага Акіяну“ (фаўністычныя нагляданьні), 7) праф. І. Г. Васількоў: „З Горак Беларускіх да Вялікага Акіяну“ (флорыстычныя нагляданьні), 8) П. С. Бойка: „Умовы жыцьця і гаспадарчай дзейнасьці перасяленцаў на Далёкім Усходзе“, 9) Ракаў: „Мэтодзіка рацыяналізатарскага досьледу устаноў і прадпрыёмстваў“, 10) праф. А. І. Кайгародаў: „Беларусь, як кліматычная правінцыя ў сыстэме клімату Эўрапейскага сухазем‘я“ 11) праф. А. І. Кайгародаў: „Галоўныя рысы клімату Беларусі, як кліматычнай правінцыі“,

12) праф. А. В. Ключароў: „Новы мэтад арганічнага дасьледваньня і вызначэньне рэакцыі срэды і яе значэньне для сельскай гаспадаркі“, 13) праф. О. К. Кедраў-Зіхман: „Беларускія фасфарыты паводле даных вэгэтацыйных досьледаў з пшаніцаю“ (работа сумесная з Лявіцкім А. Ю.), 14) праф. Ф. В. Люнгэрсгаўзэн: „Да пытаньня аб пастаноўцы курсу беларусазнаўства у ВНУ БССР“ (апошні быў заслухан на пасяджэньні Кіраўніцтва Т-ва), 15) праф. Я. Н. Афанасьеў і праф. О. К. Кедраў-Зіхман: „Аб 5-ым Усесаюзным з'езду глебаведаў у лютым 1926 г. у Маскве“.

Цэлы шэраг дакладаў заслухан на сходах сэкцый.

## Прыродазнаўчая сэкцыя.

На сэкцыі заслуханы такія даклады: 1) праф. І. Г. Васількоў: „Аб гэрбарным матар'яле беларускіх расьлін“, 2) М. М. Ганчарык: „Беларускія назовы расьлін“, 3) Н. К. Навіцкая: „Аб навуковай камандзіроўцы па біалёгічных станцыях“, 4) праф. Армфельд: „Паўтарэньне досьледу Майкельсона (прынцып адноснасьці) на узвышшы Казбэк“, 5) праф. Армфельд: „Упрошчанае паўтарэньне досьледу Майкельсона на узвышшы Казбэк“, 6) праф. І. І. Красікаў: „Насычаныя росчыны соляў, як расчынікі“, 7) К. М. Кораткаў: „Выхад прадуктаў сухой перагонкі торфу Чапелінскага балота Горацкага раёну“, 8) праф. О. К. Кедраў-Зіхман: „Некаторыя даныя аб уземадейнасьці фасфарытаў з падзолавай глебай (на аб'яднаным сходзе з агранамічнай сэкцыяй; работа сумесная з О. Э. Кедровай-Зіхман, 9) праф. П. Ф. Салаўёў: „Навукова-музэйная праца катэдры заалёгіі“ 10) Сьвірскі: „Нагляданьні над галубамі“, 11) праф. І. Г. Васількоў: „Дасьледчая і музэйная праца катэдры батанікі“.

## Агранамічная сэкцыя.

На сэкцыі заслуханы наступныя даклады: 1) Г. Р. Рэго: „Мэтады лябараторнага дасьледваньня чыстагатунковасьці аўса і ячменю“, 2) праф. Н. Н. Пелехаў: „Аб навуковым архіве Акадэміі“, 3) праф. М. І. Бурштэйн: „Досьледы пладавода-арыгінатара Алеся Сіцько на Мазыршчыне“, 4) А. Ц. Савельеў: „Асаблівасьці некаторых культурных расьлін з сям'і бабовых (Leguminosae) у адносінах да воднага рэжыму“, 5) праф. Н. Н. Пелехаў: „Сялянскае каняводзтва б. Менскай, Віленскай, Віцебскай і Магілеўскай губэрняў за тэрмін з 1888 г. па 1912 год“, 6) праф. Н. Н. Пелехаў: „К гісторыі с.-г. дасьледчай справы у б Расіі“, 7) С. І Журык: „Летняе ўтрыманьне мясцовых беларускіх кароў на сеяных травах“, 8) С. І. Журык: „Праэкт досьледу быдла на Беларусі“ (у с-г. сэкцыі ІБК), 9) Р С Гуржы: „Вынікі ад падрэзкі дзічак у гадавальніку Акадэміі у 1925 г.“, 10) Г. Р Рэго: „Уплыў вэгэтацыйных фактараў і агрыкультурных мерапрыемств на батанічны склад папуляцыі“, 11) праф. М. І. Бурштэйн: „Аб ўсесаюзнай канфэрэнцыі па садоўніцтву пры Інстытуце Прыкладной Батаныкі і Новых Культур імя Леніна ў Ленінградзе 7—14 лютага 1927 г.“ 12) праф. К. Г. Рэнард: „Усесаюзны зьезд па дасьледчай справе у Ленінградзе 15—24 лютага 1927 г.“, 13) праф. К. Г. Рэнард: „Асаблівасьці піваварaных ячменяў у зьвязку з агрыкультурнымі мерапрыемствамі“, 15) праф. С. В. Скандракоў: „Да пытаньня аб вывучэньні беларускае сялянскае шасьціпалёўкі“.

## Лясная Сэкцыя.

На лясной сэкцыі былі заслуханы такія даклады: 1) праф. В. І. Пераход: „Праблемы арганізацыі лясных гаспадарак Беларусі“, 2) праф. У. В. Шкацелаў: „Падсочка хвоі на Беларусі“, 3) Т. Н. Турыцын „Да пытаньня аб зьмене расійскіх часовых масавых табліц пры ацэнцы лесасек у БССР табліцамі па банітэтах“, 4) Г. І. Несьцярчук: „Сымбіоз і яго значэньне у лясной гаспадарцы“, 5) М. М. Медзіш: „Аб неабходнасьці досьледу над мікарызаю і сучасная пастаноўка гэтых досьледаў праф. Меліным“, 6) А. Л. Новікаў: „Тыпы насаджэньняў Беларусі“, 7) Гяоргіеўскі: „Расійскія падзваротнікі—Батумскі батанічны сад і Чаква“, 8) А. Л. Новікаў: „Тыпы дрэвастану Васілевіцкай лясной дачы; экскурсійная ураджаньні па Кашалёўскай лясной дачы і Бранскаму Дасьледчаму лясьніцтву“, 9) праф. С. П. Мельнік: „Сучасны стан Старога Парку пры Беларускай Дз. Акадэміі Сельскае Гаспадаркі“, 10) праф. В. І. Пераход: „Лясы мясцовага значэньня“, 11) Ф. П. Майсеенка: „Кароткія зьвесткі аб лясох Гомельшчыны“ 12) праф. В. К. Захароў: „Прынцыпы складаньня сартамэнтных табліц для Беларусі“.

## Сэкцыя земляўпарадкаваньня і мэліарацыі.

Сэкцыя арганізована 5-га траўня 1926 г. На сходах сэкцыі заслуханы паступныя даклады: 1) праф. П. А. Хадаровіч: „Аб формулах дапусьцімых лінейных нявязак палігонаў“, 2) праф. У. І Кіркор: „К пытаньню аб праэктаваньні палос пры земляўпарадкованьні“ (даклад на 2 агульных сходах сэкцыі). 3) праф. У. І. Кіркор: „Праэктаваные палос веярам“, 4) праф. П. А Хадаровіч: „Уплыў сыстэматычных памылак лінейных мараньняў на зьмяшчэньне вяршын палігону і уплыў разьмераў і форм палігону на няўвязку ў пярымэтру, 5) праф. П. А. Хадаровіч: „Вызначэньне шыраты з нагляданьня хуткасьці зьмяшчэньня сьвяціл па азімуту і зянітнай адлегласьці“.

Усяго дакладаў за мінулы год, ня лічучы арганізацыйных, было заслухана 57.

Членамі Таварыства прагледжана складзеная ІБК бібліаграфія па сельска-гаспадарчым галінам навук. Далей яна дапаўняецца пад наглядам Д. Р. Новікава.

## II. Краязнаўчая праца.

У зьвязку з тым, што галоўнай мэтай Т-ва зьяўляецца вывучэньне Беларусі і што гэта лягчэй можа насоўвацца з дапамогай краязнаўчых арганізацый. Т-ва увесь час імкнулася мець цесную сувязь з гэтымі арганізацыямі. Па дакладу праф. М. І. Бурштэйна, Кіраўніцтва Навуковага Т-ва 10 траўня 1926 г. прыняла праэкт сувязі Навуковага Т-ва з краязнаўчымі, наступнага зьместу:

1. Скліканьне 1—2 разы у год урачыстага пасяджэньня Навуковага Т-ва з прадстаўнікамі ад краязнаўчых Т-в і другіх грамадзкіх устаноў.

2. Выезд членаў Т-ва пэрыядычна у акругі для інфармацыі аб дзейнасьці Н. Т-ва, для чытаньня навуковых дакладаў і для азнаямленьня з працай краязнаўчых арганізацый і прыняцьце ўдзелу ў іх зьездах.

3. Запрашэньне прадстаўнікоў цэнтральных устаноў, акруговых краязнаўчых Т-в, аграномаў і сялян-дасьледчыкаў для дакладаў і інформацый у Т-ве.

4. Прыцягненьне для працы ў Н. Т-ва акруговых і раёных працаўнікоў краязнаўства і сялян-дасьледчыкаў.

5. Перыядычная інфармацыя праз прэсу шырокія колы жыхарства аб дзейнасьці Навуковага Таварыства.

Гэты праэкт быў ухвален ЦБК і прэзыдыумам Інбелкульта і па меры матар'яльнай магчымасьці проводзіўся у жыцьце.

Так. праф. Ф. В. Люнгэрсгаўзэн, І. М. Серада і праф. П. Ф. Салаўёў прымалі удзел у 2-й Аршанскай акруговай краяўзнаўчай канфэрэнцыі, дзе рабілі даклады аб дзейнасьці Н. Т-ва.

Праф. Ф. Н. Люнгэрсгаузэн выязджаў у Магілеў для сувязі з Акруговым Таварыствам Краязнаўства. Там была прачытана лекцыя на тэму „Геалёгічны нарыс Беларусі“.

22 лістапада 1926 г. праф. Ф. В. Люнгэрсгаўзэн прымаў удзел у Віцебскай акруговай канфэрэнцыі краязнаўства, дзе зрабіў даклады: 1) аб працы Навуковага Т-ва і сувязі яго з Віцебскім Акруговым Т-вам Краязнаўства і 2) Аб геалёгічных досьледах Віцебшчыны ў 1926 г. Па даручэньню Віцебскага Акруговага Т-ва Краязнаўства Праф. Ф. В. Люнгэрсгаўзэн прачытаў публічную лекцыю ў г. Віцебску на тэму „Геалёгічная пабудова БССР“.

12 сьнежня 1926 г. праф. Люнгэрсгаўзэн прымаў удзел у Аршанскай акруговай канфэрэнцыі краязнаўства.

На Горацкай раённай канфэрэнцыі краязнаўства Праф. Люнгэрсгаўзэн прачытаў даклады: „Аб пастаноўцы краязнаўчай школьнай работы“, „Геалёгічная пабудова Горацкага раёну“, „Аб пастаноўцы геалёгічных школьных экскурсый“.

Праф. Люнгэрсгаўзэнам у часы летніх досьледаў прачытан шэраг дакладаў па пытаньню краязнаўства ў Сенно, Віцебску і інш.

На 2-ім краязнаўчым беларускім зьездзе прымалі ўдзел сакратар С. І. Журык, які зрабіў даклад аб краязнаўчай дзейнасьці Навуковага Таварыства і праф. П. Ф. Салаўёў, які зрабіў даклад „Феналёгічныя нагляданьні“.

Надрукована шэраг работ па краязнаўству праф. Люнгэрсгаўзэным, праф. Салаўёвым, праф. Васільковым, праф. Мельнікам, Кісьляковым і іншымі.

Для часопісі „Наш Край“ І. А. Кісьляковым распрацованы інструкцыі і анкеты па с.-г. эканоміцы і земляўпарадкаваньню.

Заканчваецца падрыхтоўка да друку зборніку: „Апісаньне Горацкага раёну“.

Зборнік намечан такога зьместу.

1. Прадмова.
2. Клімат Горацкага раёну.
3. Фізыка-геалёгічны нарыс.
4. Глебы раёну.
5. Флёра.
6. Фаўна.
7. Сельская гаспадарка (эканоміка, палявая гаспадарка, жывёлагадоўля, садоўніцтва і гародніцтва).
8. Лясы і лясная гаспадарка.
9. Промыслы раёну.
10. Гісторыя раёну (рэвалюцыйны рух, гістарычныя рысы з жыцьця сялянства, помнікі старасьведчыны і інш.).
11. Быт раёну.
12. Народная асьвета і вышэйшая с.-г. школа.
13. Статыстычныя даныя аб раёну.

На запытаньні краязнаўчых т-в, Н. Таварыства давала падрабязныя навуковыя тлумачэньні.

11 сьнежаня 1926 г. ЦБК з прадстаўнікам ад Н. Т-ва прафэсарам Люнгэрсгаўзэнам прыняла цэлы шэраг практычных мерапрыемств па сувязі Навуковага Т-ва з краязнаўчымі.

Гэта сувязь прадбачыць, як дапамогу Навуковага Т-ва краязнаўчым навуковымі парадамі і інструкцыямі, — так і Краязнаўчых Т-в Навуковаму зборам розных матар'ялаў і дапамогай у экспэдыцыйнай працы Навуковага Т-ва.

## III. Тэрміналёгічная праца.

Тэрміналёгічная праца за мінулы год да 25 лістапада 1926 г. мела характар ня зусім выразна арганізованай, таму што ня было канкрэтных заданьняў ад Інбелкульта і ня было сродкаў.

З 25 лістапада, пасьля атрыманьня адносьніку ад Галоўнаў Тэрміналёгічнай Камісіі аб арганізацыі працы, быў апрацован Таварыствам дасканалы плян, які 9 студзеня 1927 году быў ухвален агульным сходам Навуковага Т-ва.

Ухвалена апрацоўваць тэрміналёгіі ў першую чаргу па тых галінах, па якіх да гэтага часу няма надрукованай тэрміналёгіі.

Плян прадбачыць распрацоўку тэрміналёгіі па наступных галінах: батанічная, заалёгічная, с.-г. расьлінаводная, садоўніцтва і гародніцтва, лясная, геалёгіі і глебазнаўства, мэліарацыі, жывёлагадоўлі, эканамічная, грамацка-прававая, тэхнічна-земляўпарадкаваўчая, фізыка-матэматычная, хэмічная, с.-г. машыназнаўства і будаўнічая.

Апрацоўка вядзецца па памянёных галінах у тэрміналёгічных падкамісіях.

Усе да гэтага часу выпушчаная з друку Інбелкультам тэрміналёгі маюцца на ўвазе пры далейшай рабоце.

Прадбачыцца сабіраць тэрміны ў сялян, якімі яны карыстаюцца ў с.-г. абставінах.

Гэты плян ухвален Галоўнай Тэрміналёгічнай Камісіяй Інбелкульту.

За мінулы год надрукована 20.000 тэрміналёгічных картак, якія больш чым на палову ўжо запоўнены.

Пераапрацована прысланая з Інбелкульту хэмічная тэрміналёгія спэцыялістымі хэмікамі.

Апрацована на 4 мовах расійскай, беларускай, украінскай і нямецкай глебаведная тэрміналёгія; яна будзе друкавацца на расійскай, беларускай і нямецкай мовах. Апрацована 900 тэрмінаў

Заканчваецца апрацоўка лясной тэрміналёгіі на 4 мовах у ліку 3500 слоў. Тэрміналёгія будзе гатова да друку ў траўні 1927 г.

Выпісана на карткі 2300 тэрмінаў на расійскай мове па жывёлагадоўлі і выпрацоўваюцца беларускія Будуць таксама выпісаны тэрміны і па нямецку.

Заканчваецца апрацоўка на 4 мовах с.-г.-расьлінаводнай і па с.-г. дасьледчай справе тэрміналёгія ў ліку каля 1000 тэрмінаў.

Выпісана 500 тэрмінаў па садоўніцтву і выпрацоўваюцца беларускія.

Складзен слоўнік па с.-г. эканоміцы на расійскай мове і выпрацоўваецца беларускі.

Выпісаны расійскія тэрміны па с.-г. машыназнаўству, геадэзіі, мэліарацыі і земляўпарадкаваньню.

Пераглядаецца тэрміналёгія па батаніцы і апрацоўваецца па фізіалёгіі расьлін.

Зложан кароткі с.-г. слоўнік папулярных тэрмінаў.

## IV. Выдавецкая праца.

Выдавецкая праца Т-ва праводзілася рэдакцыйнай камісіей Т-ва.

Усе работы Навуковага Т-ва праходзяць праз Рэдакцыйна-Выдавецкі Аддзел Інбелкульта.

За мінулы год выпушчана з друку два томы: „Праца Навуковага Таварыства па вывучэньню Беларусі“. Канчаецца падрыхтоўка ўпамянутага ўжо зборніку; „Апісаньне Горацкага раёну“, які выйдзе як III-ці том „Працы Таварыства“ сумесна з Горацкім Раёным Таварыствам Краязнаўства. Падрыхтоўваецца да друку IV том: „Праца Таварыства“.

Усяго будзе выдадзена да 1 кастрычніку 1927 г. чатыры томы па 12—15 друкованых аркушаў.

## V. Арганізацыйная праца.

Агульнае кіраўніцтва працай Т-ва лежала на Прэзыдыуме і Кіраўніцтве Навуковага Таварыства.

У склад Кіраўніцтва Т-ва ўваходзяць старшыня праф. Ф. В. Люнгэрсгаўзэн, намесьнік праф. О. К. Кедраў-Зіхман, намесьнік і скарбнік праф. М. І. Бурштэйн, сакратар асыстэнт С. І. Журык, члены: праф. П. Ф. Салаўёў, праф. С. В. Скандракоў, праф. А. І. Кайгарадаў, дац. І. А. Кісьлякоў, асыстэнт М. М. Ганчарык і кандыдат праф. С. П. Мельнік, які ўвесь час працаваў у кіраўніцтве.

За мінулы год Кіраўніцтва мела 19 пасяджэньняў, на якіх вырашана 118 пытаньняў.

Пытаньні разьмяркоўваюцца так: агульна-арганізацыйныя — 84, спэцыяльна па краязнаўчых пытаньнях — 19, па выдавецкіх справах — 9, па тэрміналёгічных справах — 4 і па бібліаграфіі — 2.

На працягу году два разы рабілася інфармацыя прэзыдыуму Інбелкульта аб дзейнасьці Навуковага Таварыства. Адзін раз 26 траўня і другі 9 сьнежня 1926 г.

Агульных сходаў за мінулы год было 13. На сходах заслухоўваліся навуковыя даклады і толькі 2 пытаньні было арганізацыйнага характару.

Прыродазнаўчая сэкцыя мае наступны склад прэзыдыуму: старшыня праф. І. Г. Васількоў, намесьнік праф. П. Ф. Салаўёў, сакратар П. А. Кучынскі, члены К. М. Кораткаў і Р. І. Пратасеня.

Агульных сходаў сэкцыі было 6, на якіх заслухоўваліся навуковыя даклады і зроблены выбары прэзыдыуму сэкцыі. Пасяджэньняў прэзыдыуму было адно.

Агранамічная сэкцыя—старшыня праф. М. І. Бурштэйн, сакратар М. З. Лайкоў, члены: праф. К. Г. Рэнард, дац. І. М. Серада і А. Ц. Савельеў.

Сэкцыя мела агульных сходаў 7 і 2 пасяджэньні прэзыдыуму. На агульных сходах былі заслуханы навуковыя даклады, а ў прэзыдыуме вырашаліся бягучыя арганізацыйныя пытаньні.

Лясная сэкцыя—старшыня Г. І. Несьцярчук, намесьнік праф. С. П. Мельнік, сакратар З. П. Закрэўскі і члены: Гладышэўскі і А. Л. Новікаў.

Агульных сходаў было 12 і пасяджэньняў прэзыдыуму 9.

Сэкцыя земляўпарадкаваньня і мэліарацыі — старшыня праф. У. І Кіркор, сакратар Ю. Н. Лубяка, члены: праф. П. А. Хадаровіч, І. К. Прахарэнка і Х. А. Пісаркоў.

Сэкцыя мела 7 агульных сходаў.

Навукова-Дасьледчая Камісія — старшыня праф. С. В. Скандракоў, нам. Г. І. Гарэцкі, сакратар П. П. Рыгавы, члены прэзыдыуму: праф. Н. Н. Пелехаў і праф. Я. Н. Афанасьеў. У пленум камісіі ўваходзяць 15 асоб.

Камісія мела 5 пасяджэньняў для разгляду навуковых і арганізацыйных пытаньняў.

Тэрміналёгічная камісія складаецца з старшыні праф. С. П. Мельніка, сэкратара З. П. Закрэўскага, членаў: праф. І. Г. Васількова, праф. А. С. Саноцкага, А. Ц. Савельева, С. І. Журыка, праф. М. І. Бурштэйна, А. Л. Новікава, П. А. Кучынскага, Х. А. Пісаркова, П. Сяргейчыка, Саевіча, праф. П. А. Хадаровіча, В. К. Дракіна, С. К. Каржанеўскага, праф. Ю. А. Вейса, Л. Я. Максімава, Вечара, Калядка і Сапранкова.

Камісія мела 4 агульных пасяджэньні.

Рэдакцыйная камісія — праф. І. Г. Васількоў, праф. О. К. Кедраў-Зіхман, праф. С. П. Мельнік, С. І. Журык і М. І. Бузюк.

Камісія мела 5 пасяджэньняў.

Сродкі Т-ва на 1926—27 г. складаюцца з асыгнаваньняў Інстытуту Беларускай Культуры на навукова-апэрацыйныя выдаткі 1800 р., на навуковыя выдаткі 2000 р., на выдавецтва 4500 р. Разам 8300 р.

У параўнаньні з 1925—26 г. гэта сума значна ўзрасла. Тады было асыгнавана толькі 2300 р., за якія сродкі надрукован І-ы том: „Праца Таварыства“.

У гэтым годзе Інбелкультам дана адна навуковая камандзіроўка па СССР разьмерам 130 р.

Ня можна не ўпамянуць і таго, што да гэтага часу Навуковае Таварыства не мае свайго пакойчыку, і гэта надта дрэнна адбіваецца на працу.

У канцы трэба адзначыць, што з боку Інстытуту Беларускай Культуры заўсёды былі спачуваючыя адносіны да працы Навуковага Т-ва. Часта Інбелкульт скарачваў свае магчымасьці на карысьць Навуковага Т-ва.

Трэба думаць, што ў будучыне і з кіраўніцтвам Акадэміі будуць больш наладжаныя адносіны і тады разьвіцьце працы Навуковага Таварыства пойдзе яшчэ шпарчэй.

*Кіраўніцтва*
*Навуковага Таварыства.*

Горы-Горкі, БССР.
15 сакавіка 1927 г.